вольна уехаў цэлы абоз падвод на чале з брычкай «Пушынкі», які суправаджаўся паліцаямі і жандармерыяй, а такса-ма салдатамі вермахта. На падводах ляжала нарабаванае ў жыхароў Мелясніцы дабро: вузлы з радзюжак, бочкі невялікія і вялікія – з зернем, куфры, мяшкі з бульбай, скрыні з курамі і шмат іншага. Да кожнай падводы былі прывязаны коні, каровы, козы, паліцаі падганялі дубцамі збіўшыхся ў гурт авечак. Гледзячы на гэты караван смерці, людзі здагадваліся, што адбылося ў Мелясніцы. Такія абозы і раней уязджалі ў горад, і лунінчане ведалі: калі падводы з нарабаваным дабром суправаджаюць паліцаі, значыць, – дзесьці расстралялі бязвінных ахвяр, дзесьці спалілі чарговы хутар ці вёску.

Вартаўнікі, акружыўшы спаленае паселішча, не падпускалі туды родных і блізкіх загінуўшых. І толькі праз некалькі дзён на папялішча на месцы Мелясніцы прыйшлі людзі і жахнуліся ад убачанага. Жахнуліся ад здзейсненага катамі, на пражках ваенных рамянёў якіх быў ілжывы надпіс «З намі Бог». Яны прынеслі жыхарам Лунінеччыны не хрысціянскі мір і лагоду, а знішчэнне і смерць ***(на здымку № 1 – помнік бязвінным ахвярам у адноўленай Мелясніцы)***.

У канцы 1942 года ў горадзе паявіліся некалькі вялікіх рамонтных майстэрань, у якія звазілася разбітая на франтах вайны нямецкая тэхніка.

Майстэрня па рамонту матацыклаў была размешчана ў пажарным дэпо каля царквы. Увесь двор, навакольныя вуліцы і свабодная пляцоўка каля храма былі застаўлены разбітымі матацыкламі ўсіх еўрапейскіх марак. Лёгкія і цяжкія, з люлькамі і без, – увесь гэты набіты кулямі і асколкамі металалом знаходзіўся пад адкрытым небам і амаль не ахоўваўся, да вялікага задавальнення хлопчыкаў. У кучы пабітай нямецкай тэхнікі заўсёды знаходзілі нешта каштоўнае для сябе. Аднаўляла матацыклы вялікая брыгада з рамонтнага батальёна, якім дапамагалі ваеннапалонныя.

Легкавыя і малатонныя грузавыя аўтамабілі рамантаваліся ў дзвюх майстэрнях на тэрыторыі былога гета. Тут

Былому выхаванцу дзіцячага дома з-пад Харкава, былому чырвонаармейцу-добраахвотніку Мікалаю Якавенку споўнілася толькі 17 год. Ён трапіў у палон восенню 1941 года на Украіне. Перамяшчалі па многіх лагерах, у Лунінец трапіў летам 1942-га. Мы прыносілі яму што-небудзь паесці. Аднойчы ён прапанаваў мне абмяняць вядро бульбы і тытунь на новыя нямецкія ваенныя чаравікі. Мае бацькі згадзіліся на абмен. У тыя гады амаль у кожным двары вырошчвалі тытунь. Гэта была своеасаблівая «Валюта» за працу, прадукты, рэчы і г.д. Яшчэ адзін абмен адбыўся, калі Мікалай прынёс камплект новай пасцельнай бялізны. Тады ён расказаў, што яго бацькі і браты памерлі ад голаду на Украіне ў 30-ыя гады... У 1944 годзе лагер быў ліквідаваны, ваеннапалонных некуды вывезлі.

Тут жа на тэрыторыі былога гета размяшчалася яшчэ адна нямецкая вайсковая часць, якая мела дачыненне да ветэрынарнай службы. У адным з дамоў была разгорнута палявая кавальня для падкоўвання коней, яшчэ два былі перароблены пад канюшні з асобнымі боксамі, дзе трымалі захварэўшых коней. Два разы на месяц з усіх вайсковых часцей раёна сюды прыводзілі коней. Агляд і выбракоўку рабіла цэлая камісія ваенных урачоў-ветэрынараў. Усе яны ў белых халатах вельмі пільна аглядалі коней, нешта запісвалі, нечым іншы раз мазалі асобныя часткі цела каня. Адной з працэдур была прабежка коней. Кожнага каня пад аброць павольным бегам праводзіў салдат, гаспадар каня. Пасля камісія выносіла свой прыгавор. На гэтыя своеасаблівыя агляды прыходзілі і салдаты і афіцэры, не кажучы ўжо аб жывучых побач лунінчанах.

Восенню 1942 года нямецкія акупацыйныя ўлады адабралі ў шэрагу жыхароў вуліц Чырвоная і Фабрычная агароды. За лета 1943 года савецкія і італьянскія ваеннапалонныя пабудавалі на гэтых землях ваенны гарадок - некалькі вялікіх зборных баракаў, кухню, сталовую, пункт санітарнай апрацоўкі, туалет, спартыўную пляцоўку, агарадзілі ўсю тэрыторыю шчыльным плотам, ля варот паставілі паласатую будку для варты. Тут спыняліся (рабілі перасадку) у чаканні паяздоў у Германію на суткі і больш салдаты вер-

амаль цалкам разрабавана.

Восенню 1941-га года акупанты выкарысталі закрыты, брукаваны двор склада для стаянкі палявых пякарняў. Бліскучы на сонцы металічны склад быў пафарбаваны камуфляжным жоўта-зялёна-карычневым колерам. Частку склада прыстасавалі для захоўвання гатовай прадукцыі - хлеба-булачных вырабаў, у другой частцы была абсталявана пякарня.

Штодня з варот выязджалі дзесяткі машын, якія развозілі хлеб па воінскіх часцях. Па вуліцы Шырокая (так тады называлася Чырвоная) заўсёды стаяў дурманлівы пах свежага хлеба і калі ў 1941 годзе ён не асабліва хваляваў, то ў галодных 1943-1944 гадах ад гэтага паху кружылася галава і вельмі хацелася есці. Да рэлігійных святаў - Вялікадня і Каляд, да Новага году і некаторых іншых дат, - у пякарні выпякаліся «кухены» - булкі. Хлопчыкі навучыліся красці з машын хлеб і гэтыя «кухены», асабліва зімой. На саматробных драўляных каньках мы даганялі машыну, чапляліся дротавым кручком за борт, а другім, больш доўгім дротам імкнуліся падчапіць булку хлеба ці «кухен» і, у выпадку ўдачы, хутка адчапіцца ад машыны і збегчы з дабычай. Не заўсёды гэта ўдавалася. Красці ў немцаў (хлеб ці што іншае) было небяспечнай зацеяй. Іншы раз шафёр спыняў машыну, удваіх з напарнікам выскаквалі з кабіны лавілі хлопчыка і збівалі яго. Цярпелі многія, але жаданне мець хлеб было мацней за страх. Кожны думаў, што пранясе. Іншы раз у глыбіні кузава сядзеў салдат, якога не было бачна, і тут жа біў хлопчыка прыкладам вінтоўкі. Сябар майго дзяцінства Цімафей Пракаповіч, самы смелы і адчайны сярод хлопчыкаў нашага раёна - вуліц Чырвоная, Фабрычная, Млынавая і Пінская - атрымаў пералом прадплечча ад удара прыкладам з кузава машыны. Мне пашанцавала ўсяго двойчы - «канфіскаваў» з машыны дзве буханкі хлеба. Пасля выпадку з Цімафеем кінуў гэтую справу, а сябар лячыўся ў гарадской бальніцы, за што яго бацькам давялося плаціць.

Нягледзячы ні на што, усе мы, хлопчыкі тых ваенных гадоў, адрозніваліся нейкай упартасцю, дзёрзкасцю, неабдуманасцю, безразважнасцю сваіх учынкаў, якія маглі закончыцца

стойцы паміж пярэдняй і задняй дзверцамі) на аўтамашынах. Аднойчы нават была ўзята з падваконня адчыненага акна венгерская граната. Але запаветнай марай любога з нас было выявіць працуючы акумулятар – з матацыкла ці аўтамабіля – і прынесці яго дамоў, каб мець святло. Электрычнасць часта адключалі (летам яе наогул не было). У нашым доме было тры акумулятары, і зімовымі вечарамі сям'я мела святло.

У студзені-лютым 1942 года ў Лунінцы на ўскрайку горада, дзе цяпер знаходзяцца будынкі завода «Палессеэлектрамаш», акупанты размясцілі майстэрні па рамонту лёгкіх танкаў. Тут былі выкарыстаны не разбураныя з даваенных часоў некалькі хлявоў-клуняў. Аднак знаходжанне гэтай рамонтнай базы ў горадзе было кароткачасовым. Вясной рамонтнікі перамясціліся бліжэй да лініі фронта ***(здымак 2)***.

У Лунінцы адкрылася некалькі камісійных і звычайных магазінаў. Іх уладальнікі – у большасці сваёй палякі, прыехаўшыя з Генерал-Губернатарства (так акупанты называлі Польшчу), амаль усе былі «фальксдойчамі» (асобы, якія мелі нямецкае паходжанне). У магазінах можна было купіць сахарын, курыцельную тонкую паперу маркі «Solali», каменьчыкі для запальніц, савецкую махорку, курыцельныя трубкі, партсігары, «вечныя» ручкі, гадзіннікі, свечкі, шкло для газавых лямпаў, нейкія кансервы, дарагія забаўкі з розных краін Еўропы, шмат іншых рэчаў і прадметаў невядомага паходжання. У камісійныя магазіны насельніцтва іншы раз здавала даволі прыстойныя рэчы, што засталіся з даваенных часоў. Але не заўсёды яны прадаваліся. Немцы іншы раз праводзілі канфіскацыі – проста забіралі ў насельніцтва тое, што ім спадабалася. Усё больш-менш добрае, іншы раз – старажытнае скуплялася нямецкімі афіцэрамі і чыноўнікамі (і адсылалася ў «фатэрлянд») ці прыезжымі перакупшчыкамі з Генерал-Губернатарства. Дарэчы, прадукцыя вядомых цяпер фірмаў, якія выпрабляюць мыла «Palmolive», крэм «Nivea», лекі «Bayer», радыёапаратуру «Philips», была ўжо на прылаўках лунінецкіх магазінаў – у гады акупацыі. Не ў такой колькасці, зразумела, але мыла – у тых

…пацыйныя ўлады на чале з бургамістрам Якубікам урачыста адкрылі ў Лунінцы кінатэатр. Ён працаваў для насельніцтва некалькі дзён у тыдзень, сеансы заканчваліся да камендацкай гадзіны, якая не асабліва захоўвалася. У вызначаныя дні кіно паказвалі толькі для немцаў. Некаторы час сеансы для лунінчан былі бясплатнымі. З дзяцей грошы не бралі ніколі. Хлопчыкі часцей за ўсё ўладкоўваліся на падлозе перад экранам. Зала ў кінатэатры была вузкая, доўгая з паступовым узняццем падлогі. Уваход быў быццам з двара, а некалькі выхадаў – прама на вуліцу. Паказвалі толькі нямецкія фільмы. Большасць гледачоў не разумела мовы, не ведала, пра што ідзе размова, дзе адбываецца дзеянне і калі. Але ўсё ж некалькі фільмаў запомніліся. Каляровая кінастужка пра барона Мюнхгаузена. Фільм з сюжэтам, падобным на «Дванаццаць крэслаў»: цётка памірае, пляменнік прадае спадчыну – 12 крэслаў, даведваецца пра брыльянты, шукае крэслы, знаходзіць камяні і купляе вялікую цырульню. Фільм пра нямецкіх падводнікаў. Былі і рускамоўныя кінакарціны. Двухсерыйны фільм «Жыд» – пра злых яўрэяў-масонаў у акружэнні прускага караля. Былі прапагандысцкія фільмы на рускай і ўкраінскай мовах – пра «цяжкую долю савецкіх людзей пад прыгнётам камуністаў» і пра шчаслівае жыццё партыйцаў, энкавэдзістаў, палітработнікаў-яўрэяў. Былі фільмы пра калгасы. Нешта паказвалі пра Катынь. Вялікім поспехам у немцаў-гледачоў карысталася ваенная кінахроніка «Wochenschau» (тыднёвы агляд). Калі на экране паказваліся савецкія аэрадромы з грудамі разбітых, не паспеўшых узляцець, самалётаў, дарогі Беларусі, забітыя згарэўшай разбітай тэхнікай, палаючыя вуліцы захопленых гарадоў, натоўпы палонных разгубленых чырвонаармейцаў і камандзіраў, забітых савецкіх байцоў ля разбітых гармат і кулямётаў, на гэтым фоне – пераможны марш нямецкай тэхнікі, – зала дружна апладзіравала.

**Л. КОЛАСАЎ.**

**Працяг будзе.**